## 9 красавіка 2024 году ў канферэнц-зале гатэля Marriott Vilnius Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой правяла III Беларускі бізнес-форум у краінах Балтыі.

## Марына Гірын, віцэ-прэзідэнтка Асацыяцыі беларускага бізнесу за мяжой, адкрыла III Беларускі бізнес-форум вітальным словам:

Шаноўнае спадарства!

Я шчыра радая вітаць вас. Для мяне вялікі гонар выступаць на гэтай пляцоўцы, і я шчыра ўдзячная літоўскім уладам і нашым партнёрам і сябрам, дзякуючы каторым гэты форум стаў магчымым і я маю голас на гэтай сцэне.

Тое, што тут сабраліся госці такога высокага ўзроўню, сведчыць аб неабыякавасці літоўскіх ўладаў і літоўцаў ў цэлым, аб іх імкненні вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць паміж нашымі народамі. Мы ўсе хочам дапамагчы адзін аднаму. Для гэтага мы павінны размаўляць і чуць адзін аднаго. Тым больш, што мы мелі шмат супольнага ў мінулым, а цяпер з'яўляемся часткай адной еўрапейскай сям'і.

Я хачу запэўніць: нашая асацыяцыя разумее і падзяляе занепакоенасць і страхі літоўцаў. Вашыя асцярогі адносна некаторых беларусаў абгрунтаваныя. Але не трэба забывацца, хто з'яўляецца галоўнай пагрозай для Літвы. Два дыктатарскія і крывавыя рэжымы Лукашэнкі і Пуціна сапраўды робяць усё, каб прынесці на вашую зямлю хаос і смуту. Іх задача – раз'яднаць і пасварыць нас. Мы бачым гэта як на нашай мяжы, так і ўнутры Літвы.

Ёсць беларусы, якім грошы не пахнуць. Але такія ёсць і сярод літоўцаў, і сярод іншых народаў. Схемы незаконнага заробку, абыходу санкцый і грэбаванне этыкай у бізнесе прываблiваюць шматлікіх дзялкоў, незалежна ад іх нацыянальнасці. І нашая задача супрацьстаяць гэтаму. Супрацьстаяць разам. Але таксама быць акуратнымі і мудрымі ў гэтым. Бо шмат якія беларусы таксама не згодныя з рэжымам і змагаюцца з ім, наколькі гэта магчыма. Пераважная колькасць бізнесаў, заснаваных беларусамі ў Літве, працуюць сумленна і этычна, яны ўваходзяць у топ падаткаплатнікаў Літвы, ствараюць працоўныя месцы і прыносяць вялізную карысць эканоміцы Літвы.

Нават у Бібліі ёсць прытча Ісуса пра тое, як вораг пасеяў паміж збожжам пустазелле і людзі баяліся выдзёргваць яго, каб разам з ім не знішчыць збожжа. Гэтыя людзі мусілі навучыцца аддзяляць збожжа ад пустазелля.

Так і мы павінны ўмець аддзяляць сумленны бізнес ад несумленнага. Для гэтага нашая асацыяцыя распрацавала і паспяхова выкарыстоўвае механізм унутранай праверкі – працэдуру акрэдытацыі, каб пераканацца, што сябры нашай асацыяцыі вядуць сумленны бізнес, не маюць дачынення да абыходу санкцый, рэжымаў Лукашэнкі

ды Пуціна, прытрымліваюцца Кодэксу бізнес-этыкі.

Працэдура акрэдытацыі атрымала высокую адзнаку ад шэрагу структур, сярод якіх Парламентская асамблея Рады Еўропы. Дарожнай мапай, накіраванай на падтрымку сумленнага беларускага бізнэсу, падпісанай паміж ABBA і дэпартаментам гандлю ЗША, прадугледжана сталая сумесная актуалізацыя працэсу акрэдытацыі. Мы гатовыя падзяліцца гэтым механізмам і з уладамі Літвы, прапанаваць сваю дапамогу ў вызначэнні тых, хто сумленны, і тых, хто нясе ў сабе хаос і беззаконне. Гэта ў нашых агульных інтарэсах. Мы не жадаем выбудаваць жалезную заслону паміж нашымі народамі. Але мы таксама не хочам, каб тут працавалі і зараблялі прыслужнікі рэжымаў ды іх калабаранты. Гэта ў нашых агульных інтарэсах, і мы заўсёды будзем адкрыта называць рэчы сваімі іменамі.

Я ўпэўненая, я ведаю, што нам таксама хочуць дапамагчы ў гэтым і ўлады Еўразвязу, і ўлады ЗША. Таму мы здольныя пабудаваць шчыры і эфектыўны дыялог. Мы да гэтага гатовыя! Я спадзяюся, што сённяшні форум стане працягам адкрытага дыялогу, тут мы будзем гаварыць і будзем слухаць, і абавязкова знойдзем вырашэнне складаных пытанняў.

Я жадаю поспеху ўсім нам! Я ўпэўненая, хутка мы ўсе разам зможам па-сапраўднаму ганарыцца сумленным і этычным бізнесам беларусаў, які будзе квітнець на карысць нашых народаў!

Дзякуй за вашую ўвагу і вашую падтрымку!